ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 110 (1077) АЎТОРАК, 13-га мая 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

З 15 мая па 15 чэрвеня—месячнік „Чырвонай Зьмены"

ЯЧЭЙКІ, БРЫГАДЫ „Ч. З.", ЮНКОРЫ, УПАЎНАВАЖАНЫЯ, ОРГАНІЗУЙЦЕ МАСАВУЮ ПРАЦУ ВАКОЛ ГАЗЭТЫ!

Заслухайце даклады аб „Ч. З." на комсамольскіх сходах.

Праверце працу ўпаўнаважаных і выкананьне кантрольных лічбаў па выпісцы „Чырвонай Зьмены".

Пішэце ў газэту, як праходзіць падрыхтоўка і правядзеньне месячніку.

ПРЫ МАСАВЫМ АДДЗЕЛЕ „Ч. З." ОРГАНІЗАВАНА КОНСУЛЬТАЦЫЯ ПА ПЫТАНЬНЮ „ЯК ПРАВОДЗІЦЬ МЕСЯЧНІК „Ч. З.", АДКАЗЫ ВУСНЫЯ І ПІСЬМОВЫЯ.

ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ

Комсамол Беларусі ў барацьбе за генэральную лінію партыі

(З дакладу сэкратара ЦК ЛКСМБ тав. Палякова аб рабоце бюро)

Таварышы, Студзеньскі пленум ЦК ЛКСМБ абавязаў бюро ЦК дакладваць пленуму аб ходзе выкананьня тых рашэньняў, якія былі прыняты ЦК КП(б)Б і ЦК УсеЛКСМ па дакладу беларускай організацыі комсамолу. **У чым грунтоўны сэнс тае ацэнкі, якая была дадзена ЦК КП(б)Б і ЦК УсеЛКСМ?**

Побач з некаторымі посьпехамі, у беларускай організацыі комсамолу меліся буйныя палітычныя прарывы як у кіраўніцтве, так і ў паасобных зьвеньнях організацыі. Комсамол Беларусі быў слаба мобілізаваны на барацьбу з правай небясьпекай, стаяў у баку ад барацьбы з нацыянал-дэмократызмам. Наогул, работа Беларускага комсамолу не адпавядала тым задачам, якія перад ім стаялі. **Што мы маем пасьля рашэньняў ЦК КП(б)Б і ЦК УсеЛКСМ за час работы ад 4 да 5 пленуму?**

Самае баявое пытаньне, якое стаяла перад нашай партыяй і савецкай уладай—гэта колектывізацыя сельскай гаспадаркі і вясеньняя сяўба.

Трэба сказаць, што пасьля Студзеньскага пленуму ЦК ЛКСМБ мы мелі такое становішча, што некаторыя акруговыя організацыі нарабілі шэраг палітычных памылак у правядзеньні колектывізацыі. Такім памылкам ЦК даў рашучы адпор. Рашэньні ЦК адносна тых акруг, якія дапусьцілі памылкі, паслужылі пакавам для другіх акруг. Многія акруговыя організацыі, як напр.: Аршанская і Бабруйская, па-бальшавіцку прызналі свае памылкі і выпраўлялі іх. Кіраўніцтва-ж Магілеўскай акруговай і раённых організацый ня здолелі зрабіць гэтага.

На аснове правільнай лініі партыі мы ў БССР дабіліся значных посьпехаў у колектывізацыі. На сёньняшні дзень колектывізавана 13 проц. зямельнай плошчы БССР.

БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫЗНАНЬНЕ І ВЫПРАЎЛЕНЬНЕ ДАПУШЧАНЫХ ПАМЫЛАК І ПЕРАГІБАЎ—НЕАБХОДНАЯ ЎМОВА ПАСЬПЯХОВАГА ВЫКАНАНЬНЯ ЧАРГОВЫХ ПАРТЫЙНЫХ ЗАДАЧ

У працы па колектывізацыі, мы мелі ў шэрагу месц скрыўленьні, якія выявіліся ў парушэньні прынцыпаў добраахвотнасьці, дзякуючы чаму колгасы ствараліся адміністрацыйным парадкам, замест правядзеньня растлумачальнай работы сярод беднаты і батрацтва і серадняцтва асабліва.

Характэрным прыкладам адміністраваньня можна правесьці факт, які меў месца ў Шклоўскім раёне. Адзін аграном, пры правядзеньні колектывізацыі, гаварыў, што: „савецкая ўлада нічога ня страціць, калі зьнішчыць адну вёску. Старшыня РВК гаварыў: „хто ня пойдзе ў колгас, з таго дух вон і кішкі на тэлефон". Вядома, што пры такой „растлумачальнай рабоце" сялянства пайшло ў колгасы. Другая памылка ў тым, што некаторыя нашы „колектывізатары" пераскаквалі праз сельска-гаспадарчыя арцелі да комун. Замест абагуленьня вытворчай жывёлы, абагульвалі хаты і птушкі. Белколгасцэнтр таксама не пасароміўся і даў паказаньне акругам без узгадненьня з ЦК КП(б)Б аб абагуленьні птушак.

У пытаньні тэмпаў колектывізацыі было памылковае рашэньне пленуму ЦК КП(б)Б аб суцэльнай колектывізацыі БССР у 30 годзе. Гэта рашэньне супярэчыла рашэньням ЦК УсеКП(б) і гэту памылку ЦК КП(б)Б рашуча выправіў.

У справе ліквідацыі кулацтва, як клясы, таксама былі дапушчаны перагібы так некаторыя акруговыя камітэты ЛКСМ стаялі ў баку, ад гэтай справы, а ў некаторых выпадках „раскулачвалі" серадняка, а нават і бедняка. У некаторых мястэчках раскулачвалі гандляроў і саматужнікаў.

Мы мелі шэраг фактаў правага ўхілу на практыцы, якія выявіліся ў недаацэнцы работы з батрацтвам і беднатой. Напрыклад, Лязьнянскі РК ЛКСМБ вынёс пастанову колектывізаваць сіламі РК адзін сельсавет. Ад пастановы РК перайшоў да справы. У сельсавет выяжджае сэкратар райкому і пачынае колектывізаваць без правядзеньня работы з батрацтвам і беднатой.

Чэрыкаўская парторганізацыя вынесла пастанову, што „ліст тав. Сталіна ў прынцыпе правільны, але лепш было-б, каб ён разаслаў яго сакрэтным парадкам". Гэтыя гора-колектывізатары не хацелі прызнаць і справіць свае памылкі, а звальвалі віну на вышэйшыя органы.

Пленум ЦК ЛКСМ і бюро дапусьцілі таксама памылкі. У рашэньнях Студзеньскага пленуму ЛКСМ гаварылася аб колектывізацыі БССР у 1930 годзе. Гэта рашэньне няправільна арыентавала організацыю.

Бюро ЦК па дакладу Мазырскага АК ня ўдарыла таксама па перагібах, якія былі зроблены ў галіне колектывізацыі.

Па-бальшавіцку прызнаючы свае памылкі, мы павінны мабілізаваць організацыю на іх выпраўленьне, концэнтруючы агонь па правым ухіле даваць рашучы адпор „левым" загібам, якія льлюць ваду на млын правага опортунізму.

Мы зараз маем значны паварот ячэек ЛКСМБ да задач соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, мы дабіліся зруху ў рабоце з батрацка-бядняцкай моладзьдзю, але гэта работа ўсё яшчэ ў шэрагу організацыі недаацэньваецца.

Двухмесячнік працы ў колгасах, які праводзіцца Полацкім акругкомам комсамолу, даў значныя вынікі. Гэтае мерапрыемства падхапілі ўжо некаторыя акругі (Менск).

Мы маем яшчэ і такія факты, што многія ячэйкі і камітэты нічога ня робяць у галіне колектывізацыі. Адна ячэйка (ня помню якой акругі), замест работы па колектывізацыі, напісала рэзолюцыю: „ліквідаваць кулацтва, як клясу, у тры дні".

Адна ячэйка на запытаньне РК аб колькасьці кулакоў у вёсцы адказала—кулакоў у нас няма, а якія маюцца, знаходзяцца пад кіраўніцтвам ячэйкі і будуць у хуткім часе колектывізаваны.

НАШЫ ЗАДАЧЫ

Рашуча біць па правым опортунізьме, як галоўнай небясьпецы, змагацца з „левымі" фразёрам, якія атакуюць генэральную лінію партыі неадкладна выправіць дапушчаныя памылкі, яшчэ больш змагацца за генэральную лінію партыі. Замацоўваючы дасягнутыя посьпехі ў колектывізацыі, настойліва праводзіць далейшую работу ў галіне рэконструкцыі сельскай гаспадаркі на соцыялістычны лад. Пытаньні організацыі працы, ударніцтва і соцспаборніцтва ў колгасах павінны зьвіцца асноўнай работай вясковага комсамолу. Лёзунг аб 100 пр. уцягненьні комсамольцаў у колгасы ня зьнімаецца з парадку дня. Комсамольцы—самастойныя гаспадары—павінны быць у колгасах. У раёнах суцэльнай колектывізацыі, комсамолец, які знаходзіцца па-за колгасам, павінен знаходзіцца і па-за комсамолам. Так, а ня інакш, трэба ставіць пытаньне. Сыстэматычна праводзіць работу з батрацка-бядняцкай моладзьдзю. Ні ў якім разе не забываючы аб індывідуальным сэктары, весьці далейшую работу па організацыі колгасаў.

МЫ МАЕМ ЗНАЧНЫ ЗРУХ Ў ПАВАРОЦЕ КОМСАМОЛУ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ

У справе ажыцьцяўленьня лёзунгу поўнага павароту тварам да вытворчасьці, мы маем значны зрух. Напрыклад, комсамольскі цэх швэйнай фабрыкі „Акцябр" (Гомель) у мінулым месяцы выканаў прамфінплян на 116 процантаў, а ў апошнім месяцы—на 121. Комсамольцы заводу „Комунар" (Менск) у другі раз атрымалі пераходны чырвоны сьцяг ад ВСНГБ за добры ўдзел у выкананьні промфінпляну. Але, побач з некаторымі посьпехамі комсамолу на вытворчым фронце, па рэспубліканскай прамысловасьці, прамфінплян за паўгодку выканан толькі на трох галінах вытворчасьці — швэйнай, махорачнай і вінакурнай, а па астатніх галінах прамфінплян поўнасьцю ня выканан. Так, па ўсіх галінах прамысловасьці за першае паўгодзьдзе прамфінплян выканан на 96 проц. Многія комсамольскія колектывы фабрык і заводаў стаялі ў баку ад удзелу ў выкананьні прамфінпляну. Возьмем, напрыклад, горад Віцебск. Па ўсёй прамысловасьці гораду недавыпушчана продукцыі на 914 тысяч рублёў. Цэлы шэраг прадпрыемстваў сыстэматычна ня выконвае прамфінпляну: завод „Чырвоны Мэталісты", акулярная, абутковая фабрыка, чыгунка і інш. Комсамольскія організацыі гэтых прадпрыемстваў, як і іншыя організацыі, нясуць адказнасьць за гэтыя прарывы. Многія ячэйкі апашляюць ідэю соцспаборніцтва. Мы маем прадпрыемствы, якія ў адзін і той самы час зьяўляюцца ўдарнымі і знаходзяцца на чорных дошках.

Якасьць выпускаемай продукцыі ў многіх галінах прамысловасьці вельмі дрэнная. Адносна падрыхтоўкі кваліфікаванай сілы трэба з усёй рашучасьцю адстойваць ФЗВ, як асноўную форму, да якіх асобныя гаспадарнікі бясчынна адносяцца.

БАРАЦЬБА НА ІДЭОЛЁГІЧНЫМ ФРОНЦЕ—АДНА З ВАЖНЕЙШЫХ ЗАДАЧ КОМСАМОЛУ

Трохмесячнік беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры, які быў абвешчан студзеньскім пленумам ЦК, зрабіў некаторы штуршок у напрамку ўдзелу комсамолу ў нацыянальна-культурным будаўніцтве. Але ў некаторых організацыях па-дзядзіцку, наплявацельску аднесьліся да трохмесячніку.

Трохмесячнік павысіў клясавую баяздольнасьць на культурным фронце, а асабліва ў літаратуры і мастацтве. Трэба сказаць, што гэта толькі іскра па ўдзелу комсамольскай організацыі Беларусі ў будаўніцтве пролетарскай нацыянальнай культуры. Замацоўваючы дасягнутыя посьпехі, мы павінны біць рашуча па клясава-варожых вылазках на ідэолёгічным фронце, клясавы вораг стараецца ўсімі мерамі шкодзіць соцбудаўніцтву. Напрыклад, у беларускім слоўніку „разумныя" людзі пераклалі словы так: „пролетарий"—„бядак", „бядняк"—„жабрак", „злыдзень". Тлумачэньне да сьвята 1-га мая давалася такое, што гэта ёсьць „канец жыдоўскага сьвята", аб сьвяце Кастрычнікавай рэволюцыі ў гэтым слоўніку ні слова няма.

Барацьба на ідэолёгічным фронце ёсьць адна з галоўных задач комсамолу. Асноўны ўпор трэба зрабіць на барацьбу з самым небясьпечным зараз—з беларускім нацыянал-дэмократызмам і шовінізмамі розных колераў.

ЗЬНІЖЭНЬНЕ ПРОЦАНТУ ПРОЛЕТАРСКАГА ЯДРА Ў РОСЬЦЕ—СУР'ЁЗНАЯ НЕБЯСЬПЕКА АСОБНЫХ АКРУГ ДЛЯ ЛКСМ БЕЛАРУСІ

Комсамольская організацыя БССР за апошнія два кварталы вырасла на 11 тысяч чалавек. Зусім слабы рост яе мы наглядаем па Бабруйскай акрузе, дзе процант прынятых у комсамол рабочых панізіўся на 8 проц. Рост комсамолу за лік рабочых панізіўся таксама ў Полацкай, Аршанскай, Гомельскай акругах. У многіх організацыях рост комсамолу за лік батрацтва зьнізіўся, а павысіўся за лік серадцякоў. Дрэннае становішча ў нас з актывам. Партыйнае ядро ў шэрагу організацый зьнізілася. Па даных на 1-е красавіка, партыйнае ядро ў організацыі складае 8 процантаў замест 10 у мінулым годзе.

У агуле мы маем некаторы зрух ва ўдзеле комсамолу ў колектывізацыі, у працы на вытворчасьці і нацыянальна-культурным будаўніцтве.

Але належнага пералому яшчэ няма. Далейшыя задачы ЛКСМБ—мобілізаваць комсамольскія масы і працоўную моладзь на барацьбу супроць правай небясьпекі як галоўнай, рашуча біць па „левых" загібах, цьвёрда і няўхільна праводзіць генэральную лінію партыі.

Менск, 5-му пленуму ЦК ЛКСМБ

Першы зьлёт ударнікаў Магілеўшчыны ў ліку 400 чалавек сабраўшыся ва ўмовах напружаных тэмпаў выкананьня пяцігодкі, запэўнівае ЦК, што комсамолія Магілеўшчыны, сумесна з інжынэрамі тэхнікуму, профсаюзнымі, гаспадарчымі організацыямі, усёй рабочай масай працоўнай моладзі заўсёды на перадавых флянгах соцыялістычнага будаўніцтва, будзе дапамагаць партыі ў выкананьні і перавыкананьні пяцігодкі, змагаючыся з парушальнікамі працдысцыпліны з прагульшчыкамі за перабудову працы так, каб мобілізаваць грамадзкасьць, падымаць яе актыўнасьць на вырашэньне конкрэтных задач вытворчасьці. Увесь комсамол—адзіная ўдарная брыгада!

ПРЭЗЫДЫУМ ЗЬЛЁТУ.

Магілеў—зьлёту ударнікаў

Палкае комсамольскае прывітаньне рэволюцыянэрам вытворчасьці, барацьбітам за комуністычныя мэтады працы. Упэўнены, што пад выпрабаваным бальшавіцкім кіраўніцтвам ленінскай партыі зьнішчым прарывы ў выкананьні прамфінпляну, забясьпечым выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

5-ы ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ.

Дзеньнік V пленуму ЦК ЛКСМБ

* Учора з раніцы пачаліся спрэчкі па дакладу тав. Палякова. На ранішнім пасяджэньні ў спрэчках выступіў сэкратар ЦК КП(б)Б тав. Васілевіч.

* На вячэрнім пасяджэньні пасьля спрэчак па дакладу т. Палякова і яго заключнага слова пленум заслухаў даклад старшыні дзяржпляну БССР тав. Гольдбэрга аб падрыхтоўцы кадраў.

* Сёньня з раніцы пленум заслухае садаклад АПАД ЦК ЛКСМБ тав. Щоламава аб падрыхтоўцы кадраў і задачах комсамолу.

* Для выпрацоўкі рэзолюцыі па дакладу тав. Палякова абрана камісія з 9 асоб.

Бастуючыя рабочыя асыпалі

паліцэйскі атрад градам каменьняў і прымусілі яго адступіць"

(Падзеі ў Індыі).

ЛЕНДАН, 10.—Сёньня атрыманы першыя паведамленьні аб падзеях у Шолапуры пасьля астаўленьня гораду паліцыяй і мясцовай уладай, 7-га мая забаставала большасьць фабрык. Забастоўшчыкі да дэмонстрацыі накіраваліся на дальве працуючыя фабрыкі, каб зьняць з работы, але спаткаліся з атрадам паліцыі і ўступілі з імі ў барацьбу. Бастуючыя рабочыя асыпалі паліцэйскі атрад градам каменьняў і прымусілі яго адступіць. Усьлед за гэтым пачаліся шматлюдныя дэмонстрацыі, якія закончыліся разбурэньнем ліцейных складаў. На наступны дзень пачалася дэмонстрацыйная парубка пальм, з пладоў якіх вырабляецца мясцовая гарэлка. Прыбыўшая на двух грузовіках паліцыя разагнала тых, якія працавалі на парубцы і арыштавала ўсіх зачыншчыкаў". Аднак, пры ўезьдзе ў горад адбылася сутычка з натоўпам у 2000 чалавек. Натоўп абкружыў грузавікі, пабудаваў барыкады і адбіў арыштаваных, уступіўшы ў барацьбу з паліцэйскімі. Хутка натоўп вырас да 5 тысяч чалавек. Грузавікам удалося выбрацца на дарогу, але насельніцтва з усіх дамоў дапамагла бамбардыраваць грузавікі каменьнямі. Паўстанцы перайшлі потым да актыўных нападаў на паліцэйскія вучасткі і афіцыйныя ўстановы, прычым спалілі вучасткі. Забілі 8 паліцэйскіх, некалькіх спалілі на вогнішчах, а двух кінулі ў калодзежы. Уночы з Амэндагара на станцыю Вольтур прыбыў першы батальён бомбэйскіх грэнадзёраў. Гэта дазволіла эвакуяваць эўропэйцаў. Спэцыяльны корэспондэнт „Дэйлі Тэлеграф", прыбыўшы ў Шолапур, перадае, што абстаноўка на станцыі такая, якую можна было толькі бачыць на фронце ў часе сусьветнай вайны.

ЛІСТОК „ЛЁГКАЙ КАВАЛЕРЫІ"

Кіраваць не па-кампанейску, а штодзённа

У НЕКАТОРЫХ МЯСЦОХ „ЛЁГКАЯ КАВАЛЕРЫЯ" СУСТРАКАЕ БАР'ЕРЫ ДЗЯЛЯЦКАГА РАЗУМЕНЬНЯ ЯЕ ЗАДАЧ, ГОРЫ НЯЎВЯЗАК, КАМПАНЕЙСКАГА КІРАЎНІЦТВА З БОКУ КОМСАМОЛЬСКІХ КАМІТЭТАЎ І ЯЧЭЕК

Замест бальшавіцкай барацьбы з гэтымі перашкодамі асобныя групы зложылі зброю і бязьдзейнічаюць

ТУТ „КАВАЛЕРЫЯ"—НА ЗАДВОРКАХ

„Мы заняты колектывізацыяй"

Работа „лёгкай кавалерыі" у Сьмілавіцкім раёне (Меншчына) за апошні час зусім заглохла. У раёне ёсьць ня мала атрадаў, але ніводзін не працуе як належыць, ніводзін не праводзіць у жыцьцё пастаноў усебеларускага зьлёту „лёгкай кавалерыі". Ніводзін абраны на ўсебеларускі зьлёт дэлегат, не зрабіў справаздачы перад „кавалерыстымі", якія яго абралі.

Калі пытаеш у сэкратара РК ЛКСМБ, як ідзе праца „ЛК"—ён адказвае:

— Нам не да „кавалерыі",—мы заняты колектывізацыяй.

Мы лічым, што **„лёгкая кавалерыя"—гэты масавы рабочы кантроль—ні ў якім разе ня можа быць закінута на задворкі.**

Праца „лёгкай кавалерыі" ня ёсьць праца для „лёгкай кавалерыі". „ЛК" зьяўляецца змагаром ва ўсіх галінах нашага жыцьця за соцперабудову нашай краіны.

„Лёгкая кавалерыя" павінна працаваць ва ўсіх галінах соцбудаўніцтва. Няхай-жа гэта будзе вядома сэкратару Сьмілавіцкага РК КСМ.

Г. Фрыд.

Папяровы энтузіязм

Ужо месяцаў пяць, як адбыўся раённы зьлёт „Лёгкай Кавалерыі" Краснапольшчыны (Магілеўская акруга). На гэтым зьлёце заслухвалі, ухвалялі, выносілі прыгожыя рэзолюцыі. Абралі раённы штаб „ЛК" і разышліся. Можна было-б падумаць, што пасьля такога энтузіязму лік бюракратаў і іншага шкоднага нам элементу напэўна зьменшыцца. Але жыцьцё паказала нам зусім іншае. Папяровы энтузіязм „кавалерыстых" ператварыўся ў бязьдзейнасьць.

«Лёгкая кавалерыя» Краснапольшчыны ацяжалела. Райштаб асобнымі групамі «ЛК» ня кіруе. Ад яго не адстае і райком комсамолу.

Райком бязьдзейнічае ў пытаньнях кіраўніцтва «ЛК», тады як цяпер асабліва трэба мобілізаваць апошнюю на выпраўленьне памылак, дапушчаных у галіне колектывізацыі і вясеньняй пасеўкампаніі, на выкарчоўваньне бюрократызму. А ў нашым раёне гэтага нямала.

Цімох Кандратаў.



„... Яго кабылка, учуўшы тэмпы, трушком пляцецца як-небудзь..."

Пакончым з закаранеласьцю!

У Конкавіцкім сельсавеце, вёскі **Конкавічы** (Петрыкаўскі раён) група „лёгкай кавалерыі" фактычна існуе толькі на паперы. Паколькі ёю ніхто ня кіруе, то яна нічога і ня робіць. Комсамольская ячэйка ня лічыць працу „лёгкай кавалерыі" важнай і ня цікавіцца гэтай працай. Аб рашэньнях усебеларускага зьлёту „ЛК" ні „кавалерыстыя", ні комсамольцы, ня ведаюць, адсюль зразумела, чаму „ЛК" Конкавіцкага сельсавету не пераключыла сваёй працы ў адпаведнасьці з сучаснымі задачамі.

Раённы штаб „лёгкай кавалерыі", замест кіраўніцтва, сьпіць, а ў раёне ёсьць нямала фактаў безгаспадарнасьці, расхлябаннасьці і галавацяпства, дзе кавалерыйская піка неабходна.

Па-нашаму ўжо час скончыць з закаранеласьцю ў справе кіраўніцтва „лёгкай кавалерыяй".

Язэп Шустры.

„Кавалерыстыя" займаюцца.. падрывам працы

У вёсцы Люшаве, Буда-Кашалеўскага раёну (Гомельшчына), ёсьць комсамольская ячэйка, пры якой організавана група „лёгкай кавалерыі". Група організавалася для таго, каб працаваць, каб дапамагчы партыі і савецкай уладзе хутчэй зьнішчыць недахопы ў нашым соцыялістычным будаўніцтве. І вось,—група пачала працаваць. Зрабіла „налёт" на Люшаўскае аддзяленьне спажыв. таварыства.

Але, замест дапамогі, група, сустрэла перашкоду. Аб гэтым гавораць той факт, што прыказчык крамы—партыец Жукаў пачаў пры ўсіх высьмейваць „кавалерыстых": „блазьнюкі сабраліся і займаюцца блазенствам". Другі партыец—Стукач П.—яшчэ далей зайшоў:

„Сабраліся нейкія саплякі, нейкая смаркацкая „лёгкая кавалерыя" і займаецца падрывам".

Пасьля гэтага ў „лёгкай кавалерыі" адпадае ахвота працаваць.

ШЫЛА.

„Начальнік", які ня ведае пра сваё „войска"

У Палескай ячэйцы ЛКСМБ Чачэрскага раёну (Гомельшчына), організаваўся атрад „лёгкай кавалерыі". Кіраўніком гэтага атраду быў абраны **Залман Брондзін**. *Працы ў атрадзе ніякай не вядзецца. Нават болей,—кіраўнік атраду ні разу ня склікаў пасяджэньня. Кіраўнік ня ведае колькі членаў лічыцца ў яго атрадзе.*

Бюро ячэйкі ніразу не заслухала і ня лічыць патрэбным заслухаць справаздачы кіраўніка атраду.

Некаторыя члены „ЛК" просяць Брондзіна, каб той склікаў збор „кавалерыстых", але Брондзін глух. **Дубец.**

„Ня ведаю, за што узяцца"

У Сёмкава - Гарадзецкай ячэйцы ЛКСМБ пры дзіцячай калёніі „Сёмкава" існуе група „лёгкай кавалерыі".

Спачатку „лёгкая кавалерыя" сяк-так працавала, а потым, відаць, абрыдла і яны кінулі працу. Чаму? Таму, што заслаўскі раённы штаб ня кіруе працай „лёгкай кавалерыі", ня гледзячы на тое, што пра сёмкаўскую групу „ЛК" ужо пісалі ў „Чырвонай Зьмене".

Заметка аб дрэнным становішчы працы „ЛК" у Сёмкава-Гарадзецкай ячэйцы нідзе не абгаварвалася, а таму яна і засталася «голасам лямату ў пустыні».

«Кавалерыстыя» жадаюць працаваць, яны просяць у начальніка атраду даць працу, але той разводзіць рукамі: „Ня ведаю, за што ўзяцца". Раённы штаб маўчыць, не дае ўказаньняў.

Як бачыце, „лёгкая кавалерыя" у Заслаўскім раёне фактычна ня існуе а зьлёт „лёгкай кавалерыі" яскрава сказаў—ніводнай ячэйкі без атрадаў «ЛК» і вядома справа, не такі як у Заслаўскім раёне, а працаздольных. **В. Груша.**



У вяліхіх, дакучных пошуках...

Палепшаньне дзяржапарату —баявая задача комсамолу

Пастанова бюро ЦК УсеЛКСМ аб удзеле комсамолу ў чыстцы савецкага апарату і масавым рабочым кантролі

Бюро ЦК констатуе, што, ня гледзячы на некаторыя зрухі ва ўдзеле комсамолу ў чыстцы дзяржапарату (актыўная работа „лёгкай кавалерыі", павялічэньне яе шэрагаў, некаторае ажыўленьне работы сав. ячэек, вылучэньне рабочай моладзі ў дзяржапарат), удзел усіх організацый усё яшчэ недастатковы, асабліва такіх перадавых організацый, як маскоўская, ленінградзкая, украінская. Таксама нездавальняючы ўдзел комсамольскіх організацый у рабоце шэфскіх рабочых брыгад.

2. ЦК УсеЛКСМ, надаючы выключна важнае значэньне пастановам ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб масавым рабочым кантролі над дзяржапаратам, патрабуе, каб усе комсамольскія організацыі ўзмацнілі мобілізацыю комсамольцаў і мас беспартыйнай рабочай моладзі на барацьбу з бюрократызмам і з усялякімі недахопамі ў рабоце савецкага апарату, усямерна разьвіваючы новую форму масавага кантролю зьнізу над дзяржапаратам (шэфства заводаў). Пастанова ЦК і ЦКК УсеКП(б) павінна быць растлумачана шырокім масам рабочай моладзі, яе актыўнасьць і ініцыятыва павінны быць накіраваны на ажыцьцяўленьне гэтых рашэньняў. Таму бліжэйшымі задачамі комсамольскіх організацый у гэтай галіне павінны быць:

а) Актыўная дапамога органам РСІ шляхам выдзяленьня груп комсамольцаў і беспартыйнай рабочай моладзі ў рабочыя брыгады для актыўнага ўдзелу ў чыстцы дзяржапарату і пастаноўка на комсамольскіх сходах іх справаздач аб сваёй рабоце, павышаючы гэтым удзельную вагу ўдзелу організацыі ў цэлым у праводзімай рабоце па палепшаньню дзяржапарату.

б) Пасьля сканчэньня чысткі апарату, організацыі павінны забясьпечыць штодзённы сыстэматычны ўдзел комсамольцаў і беспартыйнай моладзі ў ажыцьцяўленьні сапраўднага кантролю мас і сталага палепшаньня работы апарату ў цэлым і яго паасобных зьвеньняў, прычым праверка фактычнага выкананьня важнейшых рашэньняў партыі і ўраду дзяржапаратам павінна быць у цэнтры ўвагі комсамольцаў, якія прымаюць удзел у шэфскіх рабочых брыгадах. Асабліва неабходна дабівацца, каб моладзь праявіла ініцыятыву ў справе лепшай організацыі работы шэфскіх брыгад.

Групы „лёгкай кавалерыі", разам з актыўным удзелам у працы шэфскіх брыгад, павінны ўзяць на сябе ініцыятыву выяўленьня і праверкі такіх вучасткаў работы апараты, якія не ахоплены шэфскімі рабочымі брыгадамі, сочачы за своечасовым выкананьнем прынятых дагавароў па шэфству.

в) Камітэты комсамолу павінны забясьпечыць удзел вытворчых ячэек у справе організацыі моладзі для актыўнага ўдзелу ў шэфстве заводаў, устанавіўшы з органамі КК-РСІ шчыльнейшую сувязь, аказваючы актыўную дапамогу ў іх рабоце па ажыцьцяўленьню задач масавага ўцягненьня рабочых у справу дзяржаўнага кіраўніцтва і кантролю зьнізу над дзяржапаратам.

3. Надаючы выключнае значэньне падрыхтоўцы кадраў для дзяржапарату, ЦК абавязвае ўсе організацыі ўзмацніць вылучэньне комсамольцаў, утварыўшы пры камітэтах рэзэрвы для вылучэньня, прычым у асноўным гэтыя рэзэрвы павінны складацца з комсамольцаў і моладзі, якія актыўна працуюць у шэфскіх брыгадах, з „лёгкіх кавалерыстых", ударнікаў вытворчых брыгад і г. д. Сумесна з профсаюзнымі, савецкімі, коопэрацыйнымі організацыямі організаваць курсы па падрыхтоўцы вылучэнцаў, прапанаваць оргінструктарскаму аддзелу ЦК у месячны тэрмін закончыць падбор 200 комсамольскіх працаўнікоў для вылучэньня на работу ў цэнтральныя ўстановы.

ЦК асабліва зьвяртае ўвагу ўсіх камітэтаў і ячэек на палепшаньне кіраўніцтва і аказаньне практычнай дапамогі ў рабоце вылучэнцаў.

4. Улічваючы, што ўказаньні ЦК і ЦКК—УсеКП(б) аб наяўнасьці ў комсамоле разыходжаньняў паміж словам і справай у адносінах удзелу чысткі дзяржапарату мае значэньне баявога агляду партыі для зьнішчэньня гэтага разыходжаньня і што яно яшчэ ня поўнасьцю выкарыстана, а таксама ўлічваючы ўсю важнасьць пачатай чысткі гаспадарчага, коопэрацыйнага, профсаюзнага і нізавога савецкага апарату ў вёсцы, ЦК прапануе ўсім організацыям у найкарацейшы тэрмін дабіцца рашучага пералому ў гэтай рабоце. Кіраўніцтва камітэтаў ячэйкамі павінна быць зьменена ў бок яго дыфэрэнцыяцыі, даючы конкрэтныя паказаньні ячэйкам гаспадарчых, коопэрацыйных, савецкіх устаноў, аказваючы ў іх рабоце сталую дапамогу ў правядзеньні дырэктыў ЦК і ЦКК УсеКП(б).

5. Агромністыя патрабаваньні прад'яўленыя дзяржапарату у пэрыод соцыялістычнай рэконструкцыі, ставяць савецкія ячэйкі комсамолу перад неабходнасьцю: барацьбы за палепшаньне якасьці работы дзяржапарату, яго рацыяналізацыі, упрашчэньня, удзешаўленьня, прыбліжэньня к масам, ажыцьцяўленьня на справе клясавай політыкі партыі бязьлітаснага выкрыцьця правага опортунізму ў практыцы работы апарату, рашучага выгнаньня з апарату элемэнтаў, якія зрастаюцца з капіталістычнымі, кулацкімі элемэнтамі, альбо ня здольных даваць адпор скажэньням і спробам чужых элемэнтаў, якія імкнуцца скарыстаць апарат у сваіх мэтах,—усё гэта павінна зьяўляцца асноўнай і галоўнейшай працай кожнай ячэйкі. ЦК даручае ўсім камітэтам УсеЛКСМ праверыць работу савецкіх ячэек у гэтым напрамку з тым, каб праверка іх работы спрыяла павышэньню іх ролі ў перабудове дзяржапарату.

Абавязаць комсамольскі друк шырока асьвятляць разьвіцьцё новых форм масавага рабочага кантролю і ўдзел у гэтым рабочай моладзі, знаёмячы масы з вынікамі работы, прыцягваючы іх увагу да задачы самага актыўнага ўдзелу ў барацьбе з бюрократызмам.

6. Роля „лёгкай кавалерыі", у сувязі з няўхільным ростам актыўнасьці рабочых мас у справе барацьбы з бюрократызмам, у сувязі з разьвіцьцём масавага кантролю зьнізу над дзяржапаратам, павінна нязьмерна ўзрасьці ў справе праяўленьня сваёй ініцыятывы і пачыну ў рабоце шэфскіх рабочых брыгад. Групы „лёгкай кавалерыі" павінны выканаць сваю асаблівую ролю разьведчыкаў у рабоце шэфскіх рабочых брыгад.

ЦК зьвяртае ўвагу ўсіх комсамольскіх організацый на неабходнасьць палепшаньня кіраўніцтва працай груп „лёгкай кавалерыі" і уцягненьня мас моладзі ў яе работу, мобілізацыі „лёгкай кавалерыі" на барацьбу за выкананьне важнейшых задач, пастаўленых партыяй. (Прамфінплян, колектывізацыя сельскай гаспадаркі, палепшаньне народнага харчаваньня, чыстка і масавы кантроль зьнізу над дзяржапаратам).

7. Самакрытыка зьяўляецца адным з важнейшых способаў прыцягненьня рабочых і сялян да справы зьнішчэньня недахопаў дзяржапарату. Для далейшай барацьбы з бюрократызмам, сапраўднага палепшаньня дзяржапарату, уцягненьня рабочых у справу дзяржаўнага кіраўніцтва і кантролю зьнізу,—неабходна таксама далейшае разьвіцьце самакрытыкі шматмільлённых мас працоўных. ЦК падкрэсьлівае, што кожны комсамолец павінен рашуча разгортваць самакрытыку, бяз боязьні выкрываць конкрэтных носьбітаў бюрократызму, выяўляць хваробныя бакі асобных зьвеньняў дзяржапарату, быць актыўным застрэльшчыкам ў барацьбе за палепшаньне яго работы.

Камітэты саюзу, комсамольскія ячэйкі павінны весьці энэргічную барацьбу з спробамі заціску самакрытыкі, беручы пад сваю абарону комсамольцаў і „кавалерыстых", якія вядуць сьмелую барацьбу з бюрократычнымі скажэньнямі дзяржапарату і яго недахопамі.

8. ЦК УсеЛКСМ прапануе ўсім камітэтам на бліжэйшых пленумах сумесна з актывам абгаварыць пастанову ЦК і ЦКК аб вылучэньні рабочых у савецкі апарат і масавым рабочым кантролі зьнізу над савецкім апаратам і даную пастанову ЦК комсамолу, намеціўшы практычныя меры і прыемствы па іх ажыцьцяўленьню на мясцох.

У барацьбе за прамфінплян

Лепшы падарунак XVI парт. зьезду—перавыкананьне прамфінпляну

Разьбіваючы перашкоды, выкрываючы ілжэ-ударніцтва, організоўваючы ўдарныя і комуністычныя цэхі— крок за крокам, заваюем вышыні промфінплянаў

У БАРАЦЬБЕ ЗА ЧЫРВОНУЮ ДОШКУ

Красавік « » быў рашаючым месяцам для фабрыкі „Вэзуві" і фанернага заводу,—быць ці ня быць на чорнай дошцы?

На мітынгу рабочыя заявілі: **ШТО ДА 1-га МАЯ ЗЬНІМУЦЬ СЯБЕ З ЧОРНАЙ ДОШКІ.**

Ці выканалі гэта абяцаньне? Ня зусім. Ня ўсе яшчэ цэхі выканалі прамфінплян.

Здымка і ...пругальны цэх зьняты з чорнай дошкі, як выканаўшыя прамфінплян.

Частка работніц скрыначнага аддзяленьня і фанэрнага заводу занесены на чырвоную дошку, як адны з найлепшых ударніц.

Слабы ўдзел прымаюць комсамольцы ў выкананьні прамфінпляну. Былі выпадкі, калі кідалі працу на поўгадзіны раней гудка.

Няма кіраўніцтва з боку партыйнай ячэйкі. Фанершчыкі, ня гледзячы на ўсе перашкоды, усё-ж такі зрабілі зрух—за 25 дзён красавіка, програма выканана на 85 проц.

Да XVI партыйнага зьезду фанерны завод і фабрыка будуць зьняты з чорнай— так заявілі рабочыя.

В. Манкевіч.

Ідзе ўперадзе

Шклозавод **„Комінтэрн"**—адзін з буйнейшых заводаў па выробу шкла на Беларусі. Рабочыя з кожным днём падымаюць вытворчасьць працы, шырока разгортваючы спаборніцтва.

Калі ў мінулым годзе прагулаў было 0,35 проц., дык у гэтым годзе яны складаюць 0,13 проц. У 1928-29 годзе варштат выраблял 920 літравых бутэлек—цяпер 1027; брак зьменшыўся з 8,8 проц. да 4,65 проц.

За ўдзел у соцспаборніцтве 200 рабочых прэміяваны,—яны атрымалі месцы ў дамох адпачынку. З кожным годам завод дае большы прыбытак. Калі ў 1927-28 годзе было прыбытку 54 тыс. рублёў, у 28-29 годзе—150 тыс. рублёў, а за першае паўгодзьдзе г. г.—145 тыс. рублёў.

Так, рабочыя заводу „Комінтэрн" змагаюцца за прамфінплян, выконваюць пяцігодку ў чатыры гады

М. Х.

Дзьве прыкладныя

Кіпіць працоўны дзень...

Гудзе ваграпка нібы пропэлер, прарываючыся ў паветра. Яна сваёй ненасытнай пасьцяй глытае чыгун. Праз невялікі час выпускае яго ўжо вадкім і гатовым да ліўкі. Рабочыя заліўшчыкі чаргою падыходзяць з сваімі чарпакамі і набіраюць чыгун для заліўкі падрыхтаванных апок. Да соцыялістычнага спаборніцтва адзін вожак каштаваў 33 рублі, зараз ён каштуе ўсяго 13 р. 60 кап. Але ўдарнікі змагаюцца за тое, каб сабекошт давесьці да 9 р. 80 к.

Вытворчасьць працы ўзьнята на 26 проц. Брак зьнішчан зусім. Толькі выпадкова, па тэхнічных прычынах калі-нікалі бывае пустата адліўцы.

Не адстае і ўдарная брыгада імя „КІМ"у, сьлясарнага цэху трубапрацоўчага аддзяленьня.

Ніводнай хвіліны адпачынку машыне—так ударнікі-кімаўцы з перапынкаю выконваюць сваю паліт...тову.

Калі раней (да соц. спаборніцтва) матар'ял выкарыстоўваўся на 75-80 проц. дык зараз выкарыстоўваецца на ўсе 100 проц. Рабочы дзень ушчытнен да максымуму, так што ні адна хвіліна не прападае дарма. Але-ж ёсьць адзін „ударнік" тав. Беспразваны, які качае і шлындаецца па цэху, і гэтым самым падрывае брыгаду. Таму перад ім зараз пастаўлена пытаньне: ці з намі—у першых шэрагах будаўнікоў, ці дэзэртыраваць ад будаўніцтва.

Брыгада зусім зьнішчыла брак, грошы дзеляцца па-роўну і атрымліваюцца на адну разьліковую кніжку. Але адміністрацыя ня выканала пункту політ-умовы аб забясьпечаньні ўдарнікаў новымі часткамі для машын, бо старыя ўжо нікуды ня варты. Ня гледзячы на гэта, усё-ж ударнікі моцна трымаюць сваё вялікае званьне.

Зараз у брыгадзе налічваецца 7 комсамольцаў і 2 партыйцы. У брыгадзе ленінскага лідэйнага цэху—24 чалавекі, з якіх большая палова—партыйцы. Ф-ка налічвае зараз каля 22 ударных брыгад, палова з якіх зараз сябе не апраўдвае, а частка другой паловы мае нязначныя посьпехі. Толькі дзьве вышэйадзначаныя брыгады паказалі і далі на справе, як трэба працаваць па-сапраўднаму, па-бальшавіцку.

Менск, ф-ка „Адраджэньне"

Піла.



РАБОЧЫ:—Хопіць, дзядзька, у тыле, у габінеце сядзець! Ці ня час на фронт, на завод?

Працуюць па-ўдарнаму

Шэсьць ударных брыгад фабрыкі „Чырвоная Бярэзіна" сваёй адданасьцю рабоце дабіліся зьніжэньня сабекошту на 5 проц. больш заданьня. У мінулым гаспадарчым годзе кожная лібельшчыца выпрацоўвала па 300 лібелаў, а на сёньнешні дзень выпрацоўвае па 400.

Апраўшчыцы паднялі вытворчасьць працы ў 2 разы. Замест 480 штампаў, штампоўшчыкі выпрацоўваюць 560-570 штампаў.

Бураўшчыкі выробляюць па 600 ватэрпасаў; замест 480.

Заработак рабочых падняўся на 90 кап. у дзень у параўнаньні з мінулым гаспадарчым годам. Лібельшчыцы, дзякуючы старэннай працы, зьнізілі сабекошт на кожны лібел з 3,7 кап. да 2,9 кап. **Значна палепшылася якасьць лібел.**

Ваш.

Разьвалілі маладзёжную зьмену

На лесазаводзе № 13 (Віцебшчына) ячэйка КСМ стаіць ў баку ад гаспадарча-політычнага жыцьця. Бюро ячэйкі не падтрымлівае ініцыятывы комсамольцаў і рабочай моладзі, не рэагуе на развал ударнай маладзёжнай зьмены і на тое, што сярод ударнікаў няма ніводнага комсамольца.

А работы шмат. На заводзе налічваецца 100 чалавек моладзі. У часе ленінскога закліку было прынята 12 чалавек, за той-жа час выключана 7. Чым тлумачыцца гэта? Тым, што ў ячэйцы не вялося ніякай выхаваўчай работы. У вялікдзень большая частка моладзі, у тым ліку і комсамольцы, на работу ня вышлі.

Ударная маладзёжная зьмена разваліліся, ва ўдарных брыгадах не засталося ніводнага комсамольца. Бюро ячэйкі толькі фіксавала гэты развал, і ніякіх захадаў для організацыі ўдарніцтва ня ўжыло.

Райком КСМ і парт. ячэйка не давалі належнага кіраўніцтва комсамолу, а толькі пасыўна глядзелі на ўсё, што тварылася ў ячэйцы ЛКСМБ.

Ф. Іваноў.

У люстранай—як і раней.

На люстранай фабрыцы (Менск) аб прамфінпляне мусіць і ня чулі. У цэхах непамерны брак. Наводачны цалкам завален кучамі пабітага шкла. Ня лепш і ў шліфавальным, дзе працуюць на дзьве зьмены. Пры чым на першай зьмене—цэх перапоўнен, на другой-жа 2—3 чалавекі.

Ударніцтвам і соцспаборніцтвам фабрыка таксама не ахоплена. Самі рабочыя, па сваёй ініцыятыве, пачалі ўтвараць ударныя брыгады, але кіраўніцтва фабрыкі на гэта ніякай увагі не зьвярнула.

Належным органам трэба заглянуць на гэту фабрыку.

Блакітны.

Пачнеце кіраваць брыгадамі.

Належнага кіраўніцтва з боку партыйных і профэсыйных організацый спаборніцтвам на Лесазаводзе „Інтэрнацыянал" ня было. Удзельнікі спаборніцтва працавалі які раней. Ніякіх дагавораў не заключалі. Комуністы адмаўляліся ад удзелу ад спаборніцтва. Пераход ад індывідуальнага спаборніцтва да брыгаднага таксама прайшоў без ўдзелу партыйнай ячэйкі і завкому. Па ініцыятыве комсамольцаў організавана першая брыгада ў вінтавым цэху, потым і цьвіковым, і ў абсдных драцяных цэхах. Завком парт'ячэйка не наглядалі за работай брыгад.

Вінтавы цэх на вытворчым вэчары абвясьціў сябе ударным, але з-за недахопу разцоў і балванак ды нарэзных варштатаў—шмат прастояў. Па соц. спаборніцтву першым ідзе драцяны цэх, які раней адставаў. За сакавік ён выпрацаваў програму з перавышкай на 10 проц. За сакавік цьвіковы цэх недавыканаў програму на 7 проц. Вінтавы цэх—на 26 проц., такім чынам апошні зьяўляецца кандыдатам на чорную дошку. Завкому, партыйнай ячэйцы і комсамольскаму колектыву трэба наладзіць кіраўніцтва брыгадамі і комунамі.

М. Рэчыцкі.

СЛУХАЙЦЕ, РАБОЧЫЯ Ф-КІ „КАСТРЫЧНІК"!

Толькі пры паўсядзённым абмене вопытам, дружнай аб'яднанай працай, шырока разгорнутай самакрытыкай

МЫ ЗАБЯСЬПЕЧЫМ ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ

Рабочыя ф-кі „Беларуска" адказваюць на адкрыты ліст рабочых ф-кі „Кастрычнік".

ТАВАРЫШЫ-РАБОЧЫЯ ФАБРЫКІ „КАСТРЫЧНІК"!

Ваш адкрыты ліст да нашай ячэйкі і рабочых нашай фабрыкі, зьмешчаны ў „Чырвонай Зьмене", быў прачытан на сходзе ячэйкі сумесна з рабочай моладзьдзю нашай фабрыкі. Абгаварыўшы яго, мы адказваем вам што:

1. Бязумоўна, недахопы аб якіх вы пішэце ў сваім лісьце, у працы нашай фабрыкі маюцца налічча іх. Тлумачацца яны недахопам кваліфікаванай рабочай сілы і кваліфікаваных кіраўнікоў.

Наша фабрыка—маладая і ня мае належнага вопыту ў працы. Вось чаму недахопы, паказаныя ў вашым лісьце, для нашай ячэйкі і ўсёй заводзкай грамадзкасьці маюць асаблівую каштоўнасьць.

2. Яшчэ да атрыманьня вашага лісту на сходзе ячэйкі мы абгаварвалі пытаньне аб дрэннай якасьці нашых гузікаў. Пасьля гэтага мы прынялі цэлы шэраг мерапрыемстваў для выжыцьця гэтых недахопаў. Мы ставім на сартовачную працу комсамольцаў, якія будуць сачыць за выпускам з фабрыкі толькі добрай продукцыі. Акрамя таго, мы прымаем цэлы шэраг мерапрыемстваў па зьнішчэньню недахопаў гузікавага цэху, у якім прамфінплян выканан за першае паўгодзьдзе толькі на 50 проц. Зараз мы стварылі ў гэтым цэху комсамольскую ўдарную брыгаду, якая павяла барацьбу з гэтымі недахопамі.

За апошні час мы маем рэзкое павялічэньне выкананьня промфінпляну.

Сход выражае ўпэўненасьць у тым, што пры тэй упартай штодзённай працы, якую разгортвае зараз ячэйка КСМ і ўся грамадзкасьць фабрыкі, пры актыўным удзеле рабочых вашай фабрыкі, мы даб'ёмся ажыцьцяўленьня задач, якія пастаўлены перад намі партыяй у справе выкананьня прамфінпляну па ўсіх яго паказчыках.

АГУЛЬНЫ СХОД ЯЧЭЙКІ КСМ СУМЕСНА З БЕСПАРТЫЙНАЙ МОЛАДЗЬДЗЮ Ф-КІ „БЕЛАРУСКА"

Гузікавы цэх усё яшчэ ў хвасьце

Усім вядома аб тым, што прамфінплян на фабрыцы „Беларуска" за першае паўгодзьдзе 1929-30 году выканан усяго на 82 проц., але мала хто ведае аб тым, што гэты прарыў здарыўся выключна па віне гузікавага цэху. Затое грабёнчы ўдарны цэх, за першае паўгодзьдзе выканаў сваю програму на 106 проц. Якасьцю сваёй продукцыі гэты цэх канчаткова выціснуў з рынку БССР грэбні заможных канцэсій. Іншая справа—гузікавы цэх. За першае паўгодзьдзе ён выканаў сваю програму на 50 проц. У цэху шмат браку. Якасьць продукцыі нездавальняючая.

Тлумачыцца гэта недахопам патрэбнай кваліфікаванай сілы, адсутнасьцю належных запасных частак да машын і нядбайнымі адносінамі адміністрацыі і тэх. пэрсоналу да сваёй працы. Майстры гэтага цэху грызуцца паміж сабою, вядуць калатню і плёткі. Аб ўсіх гэтых недахопах некальні раз гаварылі на сходах рабочых партыйнай ячэйкі. Ударнікамі цэху і вытворчай нарадай было ўнесена шмат каштоўных прапаноў па ліквідацыі недахопаў але яны злачынна ня выконваліся адміністрацыяй і фабрычным камітэтам.

Заўважваецца парушэньне адзінаначальля. Напрыклад, старшыня фабкому, бяз ведама майстроў, зьняў з працы работніцу за тое, што пры машыне ня было пыласосу.

На чорнай дошцы кожны дзень вывешваюцца сьпісы прагульшчыкаў і рабочых, якія спазьняюцца на працу. Часам вывешваюць на дошку сьпісы рабочых, якія ня вышлі на работу з прычыны хваробы, чым паніжаюць аўторытэт чорнай дошкі.

Бюро комсамольскай ячэйкі слаба мобілізавала комсамольцаў і рабочую моладзь на барацьбу з гэтымі недахопамі, не змагалася за выкананьне сваіх пастаноў, пастаноў сходаў і вытворчых нарад.

Зараз ячэйка організавала прыкладныя ўдарныя брыгады з комсамольцаў і рабочай моладзі.

Брыгада юнкораў.

Політсуд над „Чырвонай Зьменай"

Сёньня 13-га мая ў клюбе Друкароў адбудзецца політсуд над „Чырвонай Зьменай".

Пачатак а 6-й гад. увечары.

III-я Фрунзэўская партконфэрэнцыя

Комсамол Фрунзэўкі--упарты барацьбіт за гэнэральную лінію партыі

Работа IV дня Фрунзэўскай партконфэрэнцыі пачалася з садакладу сэкратара РК комсамолу тав. Рэхільсона аб працы раённай комсамольскай організацыі.

Тав. **Рэхільсон** у сваім садакладзе затрымаўся на самых галоўных момантах работы раённай комсамольскай організацыі.

— Комсамол Фрунзэўкі,—сказаў тав. **Рэхільсон**,—на нашых прадпрыемствах быў застрэльшчыкам соцыялістычнага спаборніцтва, якое стала ў сучасны момант мэтадам працы нашых заводаў і фабрык. Комсамол быў ініцыятарам у організацыі ўдарных брыгад, барацьбітом за зьніжэньне сабекошту.

Комсамольскія ячэйкі організавалі на прадпрыемствах нядзельнікі па ліквідацыі прарываў у выкананьні прамфінплану.

Нашаму прыкладу пасьледавалі і старыя рабочыя. Па ініцыятыве комсамольцаў-будаўнікоў нашага раёну праводзіцца выключна сіламі моладзі пабудова дома.

Комсамол нашага раёну сваёй упартай работай па соцспаборніцтву, па выкананьню і перавыкананьню прамфінплану аказаўся ўпярэдзе іншых раёнаў, за што ад ВСНГБ атрымаў чырвоны сьцяг. Мы гэты сьцяг сваёй работай бязумоўна заслужылі і пакладзем усе сілы на тое, каб і ў далейшым ісьці ўпярэдзе.

Але гэта ня значыць, што ў нас усё добра. У нас ёсьць яшчэ шмат недахопаў. Напрыклад, на ф-цы „Беларуска" комсамол, замест таго, каб змагацца за прамфінплян, займаецца дробязямі, плёткамі. Яшчэ ў асобных комсамольскіх ячэйках соцспаборніцтва праходзіць парадна, асобныя комсамольскія ячэйкі не павярнуліся, як належыць тварам да вытворчасьці.

Мы таксама маем па асобных ячэйках моманты адхіленьня ад гэнэральнай лініі ленінскай партыі. У **Політэхнікуме** мы мелі выпадкі шовінізму, упадніцтва. На **комсамольскіх курсах** мы мелі шэраг іншых недахопаў. Усяму гэтаму быў дадзен своечасовы бальшавіцкі адпор.

Далей тав. **Рэхільсон** падрабязна затрымаўся на пытаньні ўзросту комсамолу.

— Той факт,— сказаў ён,— што на адбыўшайся беспартыйнай маладзёжнай конфэрэнцыі Фрунзэўкі было падана **200 заяў аб паступленьні ў комсамол** сьведчыць аб тым, што комсамольская організацыя карыстаецца аўторытэтам сярод масы рабочай моладзі. Але тут-жа неабходна спыніцца і на тым, што ў нас сустракаецца шэраг ненармальнасьцяй з афармленьнем і прыёмам у комсамол. Малады рабочы падаў заяву аб прыёме яго ў комсамол. Чакае тыднямі і нават месяцамі разбору заявы. Заявы ляжаць у інстанцыях (ад бюро ячэйкі да РК) не разабранымі. У гэтай галіне мы сустракаліся з фактамі цяганіны, **якую мы ўсямерна выжываем**.

Тав. Рэхільсон таксама застанавіўся і на партківраўніцтве. Ён прывёў шэраг фактаў дрэннага кіраўніцтва паасобных партячэек комсамольскімі.

У 1 друкарні пращла хваля організацыі ўдарнага руху. Комсамол, замест таго каб быць ініцыятарам гэтага руху,—спаў. Партыйны колектыў, замест таго, каб узварушыць комсамол,—бязьдзейнічаў. РК прышлося распусьціць бюро ячэйкі комсамолу 1 друкарні.

На хлебазаводзе партківраўніцтва выяўляецца ў апякунстве. Партпрымацаваны ніколі ня бывае на сходах. Мы маем шэраг фактаў адміністраваньня партпрымацаванымі комсамольскімі ячэйкамі. Працу партпрымацаваных партыйныя ячэйкі і колектывы не праўяраюць.

Далей т. **Рэхільсон** затрымаўся на становішчы і кіраўніцтве з боку комсамолу піонэр-організацый. Ён падкрэсьліў вялікі рост раённай піонэрскай організацыі. За апошні час піонэр-організацыя ўзрасла на 400 чалавек. Піонэрская праца перабудоўваецца пановаму.

— Ад імя комсамолу Фрунзэўкі,—сказаў у канцы т. **Рэхільсон**,—заяўляю партыйнаму конфэрэнцыю, што мы з гонарам выканаем ускладзеныя на нас задачы.

Комсамол Фрунзэўкі—сапраўдны барацьбіт за праведзеньне ў жыцьцё гэнэральнай лініі ленінскай партыі.

Пасьля т. **Рэхільсона** выступіў тав. **Патоцкі**, які падрабязна асьвятліў працу парттройкі за апошні час.

Затым выступіў тав. **Шулькін**, які асьвятліў працу ревізійнай камісіі. У спрэчках выступіла 9 чалавек.

Тав. **Голад** падкрэсьліў, што РК недастаткова кіруе дробнымі прадпрыемствамі, што рабочыя брыгады па колектывізацыі ў вёсках ня маюць сувязі паміж сабою, не абменьваюцца вопытам працы.

Тав. **Нісенбаум** ахарактарызаваў працу партячэйкі хлебазаводу і кіраўніцтва РК. Ён падкрэсьліў шэраг момантаў шкодніцтва на заводзе, на якія не рэагавалі ні адміністрацыя, ні профорганізацыя ні РК.

Тав. **Місюра** прывёў шэраг фактаў з работы **„Эльводу"** як некаторыя працаўнікі не разумеюць сутнасьці адзінаначальля.

— На „Эльводзе",—сказаў тав. **Місюра**,—адміністрацыя адмяніла пяцідзёнку, прыкрываючыся адзінаначальлем. Комсамольцы **Эльводу** не зьяўляюцца яшчэ застрэльшчыкамі ў працы.

Пасьля выступленьня тав. Місюры конфэрэнцыю вітаў першы сэкратар ЦК КП(б)Б тав. **Гей**. (Прывітаньне будзе зьмешчана ў чарговым нумары „Ч. З.").

Тав. **Абрамсон** застанавіўся на працы па чыстцы сав. апарату.

Тав. **Матвеенка** гаварыў аб выкананьні прамфінпляну друкарняю „Зьвязды". Ён падкрэсьліў, што партячэйка дрэнна растлумачвае значэньне ўдарніцтва.

Тав. **Левін** падкрэсьліў, што ў рэдакцыі газэты „Зьвязда" не разгорнута, як належыць самакрытыка, што маюцца факты заціску.

Далей выступіла работніца заводу дрэваапрацоўшчык.

— Некаторыя комуністы,—сказала яна,—на нашым заводзе не занялі яшчэ свайго сапраўднага месца. Не наведваюць вытворчых нарад і камісій. Не разумеюць адзінаначальля. Партколектыў у апошні час закінуў працу сярод жанчын.

Тав. Платун падрабязна застанавіўся на пытаньнях культ. будаўніцтва.

— Культбудаўніцтва,—сказаў ён,—усе лічаць трэцім фронтам і гэтаму фронту ўдзяляюць зусім мала ўвагі, а таму ня дзіва, што іменна на гэтым ідэолёгічным фронце мы маем больш прарываў. Мы яшчэ маем у нашым апараце паасобных чуждых нам працаўнікоў, маем паасобныя чужыя кніжкі, па якіх вучацца нашы дзеці.

У канцы тав. Платун адзначыў, што абвешчаны комсамолам трохмесячнік беларускай і нацменаўскай пралетарскай культуры прашоў парадна.

Неабходна ўдзяліць больш увагі пытаньню культ. будаўніцтва. **Ц.В.**

Гомель-Новабеліца

З блён-ноту юнкораў

У ячэйцы фабрыкі „Везувій" маецца 172 комсамольцы, з іх політвучобай ахоплена 159 чалавек, а рэшта зусім нідзе ня вучыцца. Прычыны крыюцца ў тым, што комсамольская ячэйка політвучобай зусім ня цікавіцца. Комсамольская політшкола ня мае сталага памяшканьня і кіраўнікоў. З прычыны гэтага комсамольцы ўцякаюць адтуль на іншыя курсы. Вельмі шмат комсамольцаў прапускаюць заняткі, мотывуючы неабходнасьцю ісьці на розныя сходы і пасяджэньні.

***

У ячэйцы фабрыкі „Чырвоны Хэмік" налічваецца 16 комсамольцаў. Політвучобай ахоплена толькі 50 проц., астатнія зусім не жадаюць займацца. Ня ўсе комсамольцы зьяўляюцца ўдарнікамі. Да політбоя ячэйка яшчэ нават і не думала рыхтавацца.

У ячэйцы будаўнікоў налічваецца ўсяго 25 комсамольцаў, а політвучобай ахоплена ўсяго 6 чалавек. Малапісьменныя нідзе не займаюцца. Аб трохмесячніку ячэйка нават і не падумала. Да політбою зусім ня рыхтуюцца. Комсамольцамі вельмі мала выпісваецца газэт.

У ячэйцы Лесазаводу 55 комсамольцаў, з іх не ахоплена політвучобай 11 чалавек. 5 комсамольцаў яшчэ да гэтага часу ня ўдарнікі. Па трохмесячніку беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры яшчэ нічога не зрабілі. Да політбою ня рыхтуюцца.

У ячэйкі саматужнікаў налічваецца 16 комсамольцаў. Не ахоплены політвучобай 4 чалавекі. Ударніцкага руху там зусім ня відаць. Самаправерка соцспаборніцтва ў ячэйцы не праводзілася. Трохмесячнік беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры ячэйкай не праводзіцца.

Трэба зазначыць, што наогул кіраўніцтва райкомамі вельмі кульгае Яны ня сочаць за тым, каб выконваліся пастановы, якія выносяцца вышэйшымі комсамольскімі організацыямі.

Ярмак і Чарняўскі.

Усім піонэратрадам гораду Менску



Шмат якія атрады пачалі шыць для піонэраў касьцюмы. Каб не атрымалася, што кожны атрад будзе мець сваю асобную форму, акруговае бюро ДКО раіць усім атрадам шыць для дзяўчатак: сінія спаднічкі і белыя блюзакі-матроскі, для хлопчыкаў—сінія альбо чорныя штаны і белыя матроскі.

Шапкі матроскія—белыя з чорнымі істужкамі, на якіх павінен быць надпіс: Мен. ДКО. Адносіны на матар'ял выдае АБДКО.

Атрады, якія самі ня маюць магчымасьці пашыць касьцюмы, павінны зьвярнуцца ў АКДКО за адносінай у швейную арцель „Пролетары".

Тэлеграмы

Паліцыя жорстка распраўляецца з рабочымі

На француcкай канцэсіі ў Шанхаі некалькі рабочых забіта і шмат ранена

ШАНХАЙ, 11. На францускай канцэсіі ў Шанхаі 5 сакавіка адбыліся сутычкі між забастаўшымі тэкстыльшчыкамі і паліцыяй канцэсіі. Некалькі рабочых забіта і шмат ранена. 20 рабочых арыштавана. Арыштаваныя трымаліся ў памяшканьні францускага паліцэйскага вучастку. Зараз высьветлена, што 6 красавіка многія з арыштаваных падпалі жорсткім, ганебным па сваіму садызму, катаваньням. (Прапускаўся моцны электрычны ток). Чацьвёра арыштаваных памерлі.

Да савецка-кітайскай конфэрэнцыі



9-га мая ў Маскву прыбыла на савецка-кітайскую конфэрэнцыю кітайская дэлегацыя. На чале дэлегацыі старшыня праўленьня К.У.Ж.Д. гунякі п. Мо-Дэ-Гуй.

На здымку: дэлегацыя накіроўваецца ў горад.

Арышт беспрацоўных

ТОКІЁ, 11-5. 300 беспрацоўных зьявіліся ў рэзыдэнцыю японскага прэм'ера Хамацугі і патрабавалі ўвесьці дапамогу беспрацоўным праз організацыю грамадзкіх работ. 5 беспрацоўных арыштавана паліцыяй.

Забастоўка супроць зьніжэньня зарплаты

БЭРЛІН, 11-5. На ліцейным заводзе „Гартун" тры тыдні вядзецца забастоўка супроць адцантага зьніжэньня зарплаты. Рэформісцкі саюз мэталёўцаў адмовіўся падтрымаць бастуючых і ў згодзе з суполкай з адміністрацыяй вярбоўку штрэйкбрэхераў. Саюз патрабуе, каб рабочыя не выстаўлялі пікетаў ля брамы заводу.

Кампанія адмаўленьня ад плацяжоў зямельных падаткаў у Індыі

ЛЁНДАН, 11. У Індыі падрыхтоўваецца кампанія адмаўленьня ад плацяжу зямельных падаткаў. Конфэрэнцыя сялян Вардолі і Талука заявіла: «Мы будзем у нашай барацьбе пераносіць самыя лютыя атакі і гатовы сустрэць нават сьмерць». Конфэрэнцыя пагражае бязьлітасным байкотам чыноўнікаў, якія застаюцца на пастох і спаганяюць падаткі.

Нанкінскі фронт прарваны

ПЭЙПІН, 11-5 Стаўка Шана паведамляе, што войскі ночнаў разьбілі дывізію нанкінскага войска ў раёне Пэнпу. Нанкінскі фронт прарваны, захоплены палонных. Часьці паўночных цягваюць наступ.

Перад масавымі экономічнымі баямі

Прадпрыемцы камэнна-вугольнай прамысловасьці Рурскай вобл. маюць намер звольніць 50.000 гарнякоў

БЭРЛІН, 11-5. У сувязі з надыходзячымі масавымі экономічнымі баямі ў паўночна-заходнім прамысловым раёне Нямеччыны, прадпрыемцы пры падтрымцы рэформісцкіх профбюракратаў пачалі рашучае наступленьне на рабочых. На заводах „Фэнікс" у Дзюсельдорфе прадпрыемцы звольнілі 120 рабочых за ўдзел у комуністычнай дэмонстрацыі. Міжнародны сталёвы Картэль, які скараціў сваю вытворчасьць ужо на 10 проц. абвясьціў аб тым, што ў бліжэйшым часе вытворчасьць будзе скарочана на 20 процантаў, што пацягне за сабой звальненьне дзесяткаў тысяч рабочых. Прадпрыемцы камэнна-вугольнай прамысловасьці Рурскай вобласьці маюць намер звольніць 50 тысяч гарнякоў.

Арышт комсамольцаў у Францыі

ПАРЫЖ, 12-5. За ўдзел у першамайскіх забастоўках і дэмонстрацыі, у Пантэры арыштаваны рэдактар комуністычнай газэты „Работніца". У Лілі арыштаваны комсамольцы Кулён, Саклёв і рэдактар газэты „Аншэнэ Д..." Даюмэніль. У Алужы арыштаваны 4 работнікі унітарных профсаюзаў.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

14-V, а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні Дому Комсамолу (2-гі паверх, чытальня) Мен. АК, КРК і ФРК КСМ склікаюць нараду апоргаў і масавых працаўнікоў яч-к па пытаньню падрыхтоўкі і правядзеньня палітбою.

Адказнасьць за своечасовую яўку ўскладаецца на сакратароў ячэек КСМ. Мен. АК ЛКСМБ, КРК і ФРК

Адказны рэдактар—Рэдкалегія

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599